# Усходні гараскоп на наступны тыдзень



**АВЕН.** На гэтым тыдні выкарыстоўвайце сваю камунікабельнасць на сто працэнтаў, гэта дапаможа ў рэалізацыі планаў і задум. У аўторак магчыма ўдалыя паездкі і камандзіроўкі. У сераду, здаецца, у вас усё будзе валіцца з рук, проста зрабіце паўзу. Пятніца — вельмі ўдалы дзень для рамантычных знаёмстваў ці сямейных спраў.



**ЦЯЛЕЦ.** Не спіце, ваш поспех зусім побач, трэба толькі праявіць найлепшыя якасці і на час забыцца пра ляноту і пасіўнасць. Не варта мяняць месца працы або пачынаць новыя праекты, лепш накіраваць сілы на навядзенне парадку ў справах і сувязях. Чацвер можа стаць даволі складаным днём, спатрэбіцца ўсё ваша самавалоданне, каб захаваць спакой.



**БЛІЗНЯТЫ.** Тыдзень дастаткова спакойны і гарманічны, таму лепш прысвяціць яго адпачынку, не ўскладняючы сітуацыю, не варта мяняць свой звыклы лад жыцця. Адным з важных фактараў могуць стаць зносіны, спатканні і рамантыка. Адчуеце, як трывога сыходзіць і мары ажыццяўляюцца.



**РАК.** Імкненне да самаўдасканалення, пад знакам якога павінен прайсці гэты тыдзень, пойдзе на карысць. Вы станеце вельмі прыцягальнай асобай і проста ідэальным суразмоўцам. Не вельмі давярайце новым знаёмым, побач з вамі можа апынуцца абаяльны, але пусты чалавек. А вось да меркавання блізкіх варта прыслухацца. Спрыяльны час для вырашэння надзённых жыллёвых пытанняў.



**ЛЕЎ.** Настройцеся на актыўны дзеянні, гэта дазволіць узняцца на больш высокі ўзровень, пачынайце паступова вучыцца таму, чаго вам не хапае. Серада прынясе спакой і ўнутраную гармонію. У чацвер варта падрыхтаваць сябе да сюрпрызаў, не заўсёды прыемных. Не паддавайцеся сумным думкам, ганіце прэч нуду. Кіслая фізіяномія — гэта апошняе, што вам цяпер трэба.



**ДЗЕВА.** На гэтым тыдні пажадана заняцца вырашэннем бягучых праблем, не дазваляйце беспадстаўным сумневам перашкаджаць гэта рабіць. Вам цалкам па сілах стварыць вакол сябе пазітыў і дарыць навакольным цеплыню і радасць. У аўторак можа спатрэбіцца парада кампетэнтнага чалавека. У чацвер паспрабуйце не зацягваць з афармленнем дакументаў. Пятніца — удалы дзень для дзелавых сустрэч і публічных выступаў.



**ШАЛІ.** Вашы справы пойдуць значна больш паспяхова, калі для рэалізацыі планаў заручыцеся падтрымкай блізкіх. На гэтым тыдні магчыма супрацоўніцтва з кімсьці з ранейшых саюзнікаў. Не выключана частковая змена дзейнасці, падобна, у вас пачнецца гарачы раман. З уласцівай вам упартасцю і працавітасцю зможаце вырашыць усе праблемы.



**СКАРПІЁН.** Будзеце вельмі паспяховыя, асабліва калі ўсё дакладна сплануеце і будзеце кантраляваць эмоцыі. У сераду прыемныя нечаканасці падымуць настрой. На рабоце чакаюцца спрыяльныя перамены, з'явіцца магчымасць кар'ернага росту. Будзьце чулыя і ўважлівыя, не выключана, што хтосьці з блізкіх мае патрэбу ў вашай дапамозе, але сарамеецца сказаць пра гэта.



**СТРАЛЕЦ.** Удача на вашым боку — будзе паспяховай любая дзейнасць, звязаная з выкладаннем, навучаннем, спортам, забаўкамі. З'явіцца магчымасць узняць прафесійны аўтарытэт, але ўзамен на вас ляжа і адказнасць. Вам будуць аказваць давер і чакаць падтрымкі. Дапамога блізкаму — гэта выдатна, але не рабіце нічога на шкоду асабістаму жыццю. Пастарайцеся не падаўляць ініцыятыву блізкіх.



**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні спатрэбіцца развагі і стрыманасць: толькі гэтыя якасці змогуць хоць неяк змякчыць імпульсіўнасць. Не варта раздражняцца. Памятайце, што выхад сітуацыі, якая склалася на працы, будзе залежаць шмат у чым ад вас. У першай палове тыдня спрыяльныя дзелавыя візіты і паходы ў госці. Субота можа аказацца самым складаным днём: вас выпрабуюць на трываласць.



**ВАДАЛІЎ.** Вы будзеце таямнічыя і поўныя сакрэтаў. Багацце кампліментаў на гэтым тыдні можа закружыць галаву, але самае цікавае, што ўсе гэтыя прыемныя словы — праўда. Жаданні пачнуць выконвацца, так што, загадваючы іх, будзьце асцярожныя. У аўторак не саромейцеся выкарыстоўваць сваё абаянне не толькі ў асабістых, але і ў дзелавых мэтах. У выхадныя будзьце гатовыя весяліцца і забаўляцца напоўніцу.



**РЫБЫ.** Навучанне чамусьці новаму, цікаваму, што дазваляе пашырыць гарызонты вашых магчымасцяў, прынясе ўпэўненасць ва ўласных сілах. Аднак не варта задзіраць нос. Можна разлічваць на дапамогу сяброў і заступнікаў. Магчымы далёкія паездкі і вельмі нечаканыя знаёмствы.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.04 | 20.18 | 14.14 |
| Віцебск — | 5.51 | 20.11 | 14.20 |
| Магілёў — | 5.54 | 20.08 | 14.14 |
| Гомель — | 5.55 | 20.01 | 14.06 |
| Гродна — | 6.20 | 20.32 | 14.12 |
| Брэст — | 6.24 | 20.29 | 14.05 |

### Месяц

*Поўня 19 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Цяльца.*

### Імяніны

***Пр.** Аляксандра, Васіля, Максіма, Фёдара.*
***К.** Маліны, Мальвіны, Міхаліны, Юрыя.*



Фота Лізаветы ГОЛАД.

## ЗАЎТРА




### ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +31..+33°С | КІЕЎ +31..+33°С | РЫГА +29..+31°С |
| ВІЛЬНЮС +29..+31°С | МАСКВА +26..+28°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +29..+31°С |

## 24 ЖНІЎНЯ Даты Падзеі Людзі

У краіне



**1847** год — нарадзіўся (г. Пружаны) Аўгусцін Канстанцінавіч Пацэвіч, заслужаны ўрач-філантроп. Большую частку жыцця пражыў у родным горадзе, дзе карыстаўся вялізным аўтарытэтам за дабрачынную дзейнасць. У падзяку за заслугі цэнтральная вуліца Пружан у 1926 годзе была названа яго імем. Набажэнствы з прычыны яго смерці прайшлі ў храмах усіх веравызнанняў горада і ваколіц.

**1931** год — нарадзіўся Юрый Паўлавіч Альбіцкі, мастак кіно, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Скончыў Усесаюзны інстытут кінематаграфіі ў Маскве. Працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм». Мастак-пастаноўшчык кінафільмаў «Запомнім гэты дзень», «Крушэнне імперыі», «Вазьму твой боль» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1949** год — нарадзіўся (в. Моладава Іванаўскага раёна) Пётр Іванавіч Брыгадзін, беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Беларусі. У 1971 г. скончыў БДУ. Быў на камсамольскай і партыйнай рабоце. З 2000 г. рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, з 2001-га — міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь, пасля — дырэктар Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ. Даследуе гісторыю Беларусі XIX—XX стст., палітычную гісторыю, праблемы дзяржаўнага кіравання.

У свеце

**79** год — адбылося найбольш вядомае і самае жудаснае вывяржэнне Везувія. Гэта прывяло да гібелі трох гарадоў — Пампеі, Геркуланума, Стабій — і некалькіх невялікіх паселішчаў. У працэсе раскопак высветлілася, што ў гарадах усё захавалася такім, якім было да вывяржэння. Пад шматметровай таўшчынёй попелу былі знойдзены вуліцы, дамы з поўнай абстаноўкай, шкілеты людзей і жывёл, якія не паспелі выратавацца. Сіла вывяржэння была такая, што попел ад яго далятаў нават да Егіпта і Сірыі. З 20 000 жыхароў Пампеі у будынках і на вуліцах загінула каля 2000 чалавек. Большасць жыхароў пакінулі горад да катастрофы, аднак астанкі загінулых знаходзяць і за межамі горада. Сярод ахвяр — і рымскі гісторык Пліній Старэйшы, які з навуковай цікавасці спрабаваў наблізіцца да Везувія на судне і лепш разгледзець вывяржэнне і апынуўся ў адным з ачагоў катастрофы — у Стабіях.



**1899** год — нарадзіўся Хорхе Луіс Борхес, аргенцінскі празаік, паэт, публіцыст. Борхес вядомы перш за ўсё лаканічнымі празаічнымі фантазіямі, якія часта хаваюць пад сабой разваргі аб сур'ёзных навуковых праблемах ці прымаюць форму прыгодніцкіх або дэтэктыўных гісторый. Эфект праўдзівасці выдуманых падзей дасягаецца ў Борхеса ўводзінамі ў аповед эпізодаў аргенцінскай гісторыі, імёнаў пісьменнікаў-сучаснікаў, фактаў уласнай біяграфіі. У 1920-я гады стаў адным з заснавальнікаў авангардызму ў іспанамоўнай лацінаамерыканскай паэзіі.

**1949** год — набыў сілу дагавор аб стварэнні паўночна-атлантычнага альянсу — НАТА.

**1991** год — М. С. Гарбачоў заклікаў да самароспуску КПСС і пакінуў пасаду генеральнага сакратара ЦК партыі.

Так гаварыла...

**ДЖЭБРАН ХАЛІЛЬ ДЖЭБРАН:**

*«Паэзія — гэта паток радасці, болю, здзіўлення і невялікая крыха слоў са слоўніка».*

## УСМІХНЕМСЯ

— Табе выпадкова мядзведзь на вуха не наступаў?
— У мяне абсалютны музычны слых...
— Пры чым тут слых, ты на вуха сваё паглядзі!

**Маленькае дзіця плача. Мама ў паніцы:**
**— У яго нешта баліць!**
**Тата (у здзіўленні):**
**— Што ў яго можа балець? У яго ж усё новае.**

На філфаку я атрымаў адукацыю, несумяшчальную з жыццём.

**— Я яшчэ ні разу не сустракаў разумнага чалавека. Хачацца пра гэта знаёмым распавесці, але наўрад ці хтосьці ўзрадуецца.**

— Любы, гэтая сукенка мяне паўніць?
— А гэтая кашуля робіць мяне лысым?
— Але ж ты і так лысы.
— Вось у гэтым і справа!



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10 896. Індэкс 63850. Зак. № 1918.

Нумар падпісаны ў 19.30 23 жніўня 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12